*Роднае газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**7** ЛІПЕНЯ 2007 г. СУБОТА

№ 125 (25990)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

*Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў суайчыннікаў са знамянальнай датай — 125-годдзем з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы, якое адзначаецца 7 ліпеня.*

*Янка Купала належыць да кагорты мысліцеляў і асветнікаў, якія пакінулі значны след у духоўным жыцці нашай краіны, гаворыцца ў віншаванні. У айчынную гісторыю Янка Купала ўвайшоў, перш за ўсё, як паэт-грамадзянін, родаачальнік сучаснай беларускай літаратуры, якая дзякуючы яго творчасці набыла сусветную славу і прызнанне.*

*«Усё жыццё Янкі Купалы прасякнута імкненнем бачыць Айчыну незалежнай, мірнай і магутнай дзяржавай. Сённяшняя суверэнная Беларусь з высокім узроўнем эканамічнага, навуковага і культурнага развіцця з'яўляецца ўвасабленнем мар вялікага песняра», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.*

*«Няхай і ў далейшым творчая спадчына Янкі Купалы будзе для нас прыкладам сапраўднага патрыятызму і самаадданага служэння Радзіме», — гаворыцца ў віншаванні.*

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



## *Янка Купала:*

# «Я АДПЛАЦІЎ НАРОДУ, ЧЫМ МОЦ МАЯ МАГЛА: ЗВАЎ З ПУТАЎ НА СВАБОДУ, ЗВАЎ З ЦЕМРЫ ДА СВЯТЛА»

## Янка Купала быў шчырым сябрам газеты «Звязда»



ЗВЯЗДА

**Напярэдадні 125-гадовага юбілею паэта ў нашу рэдакцыю звярнулася нямала чытачоў з прапановай расказаць аб сувязях Янкі Купалы з газетай «Звязда».**

**Янка Купала быў сапраўдным сябрам «Звязды». Часта наведваў рэдакцыю, даваў парады, дзяліўся сваімі меркаваннямі аб надрукаваных у газеце мастацкіх творах.**

**Здымак, які мы публікуем сёння, — Янка Купала ў рэдакцыі «Звязды» (шчыра ўдзячныя за прадастаўленую магчымасць Дзяржаўнаму літаратурнаму музею Янкі Купалы і асабіста галоўнаму захавальніку фондаў Марыі Кандратаўне Чабатарэвіч).**

**Гэта «афіцыйны» візіт у газету. 12 лютага 1939 года «Звязда» паведаміла, што Янка Купала і Якуб Колас разам з іншымі пісьменнікамі-ардэнаносцамі наведалі рэдакцыю. На завяршэнне сустрэчы сфатаграфаваліся разам з журналістамі «Звязды». А «нефармальных» сустрэч са «Звяздой» і ў «Звяздзе» — творчых, сяброўскіх, душэўных — было шмат.**



***Янка КУПАЛА і Якуб КОЛАС у рэдакцыі «Звязды», 1939 год.***

У 1926 годзе «Звязда» распачала дыскусію аб роднай мове — Янка Купала браў у дыскусіі актыўны ўдзел. І невыпадкова.

Яшчэ ў 1914 годзе ў артыкуле «Ці маем мы права выракацца роднай мовы?» ён пісаў:

«Яўляецца пытанне: чаму ж так трымаліся беларусы ўсяго свайго роднага? Чаму, калі мо каторы і навучыўся чагосьці чужога ў чужой школе ці так у чужыне, — дома ўсяго чыста забываўся? Ці ж мы мелі кароткую памяць, ці не любілі асветы? Адказ тут, як ні круці мазгамі, — адзін: склад душы беларуса, яго думак, звычаяў, поглядаў на жыццё быў свой, і была ўся тая мова родная, узгадовываўшая яго цэлыя тысячы лет; гэта душа яго душы — мова зраслася з ім, як зрастаецца са сваім каранём дзерава: падкапайцеся пад дзерава, абсячыце дазванне яго карэнні — дзерава завяне, засохне, перастане жыць. Беларус часта мо і не цяміў, чаму ён так трымаецца сваёй гутаркі, але не трымацца яе не мог: выракаючыся мовы сваёй, быў павінен вырачыся самога сябе, выкрывіць сваю душу, выракаючыся, павінен быў ісці проці ўсяго святога, непадменнага на свеце, проці ўсяго таго, што паказвае адменнасць чалавека ад скаціны».

Купала ўжо з першых крокаў у Паэзію адчуваў, што ў мове — душа народа, адметнасць бачання свету, тое непаўторнае, што вылучае яго сярод іншых народаў. Беларуская мова, доўгі час пазбаўленая кніжнай апрацоўкі, глыбінна адлюстроўвае характар беларусаў — працавітага, цярплівага народа.

*Ты зжылося з намі,*
*бацькоўскае слоўца,*
*Як бы корань з дрэвам,*
*як бы з небам сонца;*
*Дзеліш з намі вечна ўсё,*
*што з намі ходзе*
*У благой і добрай*
*мачысе-прыродзе.*

Зусім не, Купала не ідэалізаваў беларусаў: «...паяўляліся між беларусамі рэнегаты, здрайцы свайго краю і народа, але на іх не звертана ўвагі, як не звяртаецца на ўсякага роду адшчапенцаў, затраціўшых воблік і падабенства Божае».

* * *

У «Звяздзе» ўпершыню друкаваліся многія творы Янкі Купалы — паэмы «З угодкавых настрояў» (1927), «Над ракою Арэсай» (1933), «Барысаў» (пад назвай «Да адкрыцця помніка Леніну ў Барысаве», 1934), урывак з паэмы «Тарасова доля» (1939).

Каля 70 вершаў паэта ўпершыню апублікаваны менавіта ў «Звяздзе». На старонках нашай газеты ўпершыню былі змешчаны і пераклады Купалы: уступ да паэмы А.С. Пушкіна «Медны коннік» (1937), вершы Т. Шаўчэнкі (1936, 1939).

Янка Купала выступаў у «Звяздзе» з публіцыстычнымі артыкуламі, пісьмамі, прамовамі. Газета інфармавала пра літаратурную і грамадскую дзейнасць паэта, паведамляла пра яго вечары-сустрэчы з чытачамі, паездкі па краіне...

Але ж былі і іншыя публікацыі...

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

**Сёння ў 11.00 у Купалаўскім парку адбудзецца ўрачыстае ўскладанне кветак да помніка Янку Купалу. Адразу пасля гэтага пачнецца гарадское свята паэзіі «Палымянае слова паэта» з удзелам вядомых беларускіх паэтаў і грамадскіх дзеячаў. Свята паэзіі пройдзе таксама і ў Вязынцы.**

Напярэдадні 125-годдзя паэта мы папрасілі нашых чытачоў адказаць на пытанне

# «Што значыць для вас Янка Купала?»

**Марыя ЗАХАРЭВІЧ, народная артыстка Беларусі, актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы:**

— Для мяне, як і для кожнага беларуса (і не толькі беларуса), Янка Купала — гэта вялікі чалавек, геніяльны паэт, які сапраўды маліўся сваёй «распетаю душой», каб яго край, яго народ стаў больш шчаслівым. Янка Купала хадзіў тымі ж сцежкамі, вытаптанымі горам, вымытымі морам слёз, — як і ўсе людзі... Ён разумеў душу чалавека — і сваёй балючай душой адгукаўся на цяжкую долю нашага народа. Найвялікшае яго жаданне было — каб беларусы «людзьмі зваліся».

Я добра ведаю творчасць Купалы, але толькі нядаўна па-сапраўднаму адкрыла для сябе любоўную лірыку паэта, гэтыя цудоўныя, непаўторныя вершы!

*Не глядзі на мяне,*
*Не глядзі — адыдзі!..*

У нашым тэатры працавала выдатная артыстка Галіна Бальчэўская (на жаль, заўчасна пайшла з жыцця), яна сябравала з Паўлінай Мядзёлкай, якая шмат расказвала пра Купалу...

У свой час я павінна была іграць ролю Паўлінкі. Роля ў мяне ўжо была амаль што гатова, але так трагічна склалася маё асабістае жыццё... мне не давялося сыграць Паўлінку. А вось цяпер я іграю маці Паўлінкі ў спектаклі «Паўлінка», які ідзе ў нашым тэатры з 1943 года. Спектакль быў пастаўлены ў час Вялікай Айчыннай вайны ў горадзе Томску. І зараз ён ідзе з перапоўненай залай і так прымаецца публікай — як быццам мы іграем прэм'еру (а іншы раз і лепш, чым нейкую прэм'еру). Звычайна пасля кожнага спектакля я жартам гавару: «Віншую ўсіх з прэм'ерай!» — бо так прымаюць «Паўлінку» гледачы.

У спектаклі «Тутэйшыя» я іграю Ганулю, маці Мікіты Зносака. Гэта даволі складаная роля, але я вырашаю яе наступным чынам: мой сын памыляецца, таму я яго і шкадую, і не разумею, і хачу зразумець, бо гэта мой адзіны сыночак... Надзвычай цікавая праца!

...Хачу вось на што звярнуць увагу: пры ўсёй сваёй геніяльнасці Янка Купала быў такі сціплы, такі просты. І нават у вершы:

*Я не паэт, о крый мяне божа!*
*Не рвуся я к славе гэткай німала,*
*Хоць песеньку-думку і высную можа,*
*Завуся я толькі — Янка Купала.*

*Славу паэтаў разносяць па свеце,*
*Вянкі ўскладаюць і звоняць пахвалай,*
*Я ж ціха йграю, хто ж ціхіх прымеце?*
*Ат! ведама, з вёскі — Янка Купала!*

*Кожны край мае тых, што апяваюць,*
*Чым ёсць для народа ўпадак і хвала,*
*А беларусы нікога ж не маюць,*
*Няхай жа хоць будзе Янка Купала...*

Той, хто сустрэнецца з Янкам Купалам на старонках яго кніг, — адчуе сапраўднае свята. Асабіста для мяне паэзія Купалы — заўсёднае свята.

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

## ШТАРМАВОЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ

У бліжэйшыя суткі ў многіх раёнах рэспублікі захаваецца моцны вецер з парывамі да 15—20 метраў у секунду. Уначы на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі чакаюцца моцныя ліўні, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. У сувязі са складанымі ўмовамі надвор'я Гідраметэацэнтр аб'явіў па рэспубліцы штармавое папярэджанне.

## ПАЎТАРЫ НОРМЫ ДАЖДЖОЎ

За дзве ночы (5 і 6 ліпеня) у шэрагу раёнаў Брэстчыны выпала вялікая колькасць ападкаў — больш як паўтары месячныя нормы. І ў гэтым плане вылучыўся Ганцавіцкі раён. Тут вылілася вады аж на 162 працэнты! Прыкладна столькі ж выпала ападкаў і ў Ляхавіцкім раёне. Суткамі, з невялікімі перапынкамі, ішлі дажджы і ў суседніх.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

ISSN 1990 - 763X

07125>

9771990763008

## НАРОДНАМУ ПАЭТУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА



Сёння, 7 ліпеня, у 125-ы дзень народзінаў Янкі Купалы, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі краіны ўводзіць у паштовае абарачэнне адмысловы мастацкі канверт. На ім — партрэт Песняра, яго родная Вязынка, малюнак паводле твораў, на марцы — будынак музея... Падрыхтаваны канверт выдавецкім цэнтрам РУП «Белпошта». Мастак Мікалай Рыжы. Сёння на Мінскім паштамце — спецыяльнае памятнае гашэнне.

## БУЯНІЎ ВЕЦЕР НА ПРАСТОРАХ

Жлобінскага, Мазырскага, Ельскага, Лельчыцкага і Калінкавіцкага раёнаў Гомельшчыны. Ды такі моцны, што часова вывеў са строю восем высакавольтных ліній магутнасцю 110 кілават і 35 — магутнасцю дзесяць кілават, а таксама 413 трансфарматарных падстанцый. Без электрычнасці з-за гэтага заставаліся 99 населеных пунктаў і 33 малочнатаварныя фермы. Намаганнямі спецыялістаў пашкоджанні былі ліквідаваны, але перасцярога застаецца, бо сіноптыкі прагназуюць на тэрыторыі вобласці сілу ветру ў 24 метры ў секунду.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## «ГАРЭЛКА АЛЬБО АКУЛЯРЫ ЗА $2000!»

У жыхаркі Мінска рабаўнік нахабна адабраў сонечныя акуляры коштам 2 тысячы долараў. Як паведаміла прэс-афіцэр Цэнтральнага РУУС сталіцы Святлана Кабкова, злачынства было здзейснена сярод белага дня ў двары дома, дзе жыла пацярпелая. Да яе падышоў сусед, адабраў дарагія сонечныя акуляры і запатрабаваў грошы на гарэлку. Калі пацярпелая адмовілася «спансіраваць» выпіўку, той ударыў жанчыну ў твар і яшчэ раз прад'явіў свой ультыматум: гарэлка альбо акуляры! На роздум сваёй ахвяры рабаўнік даў некалькі хвілін, прыгразіўшы, што ў выпадку адмоўнага адказу прадасць дарагую рэч, а на выручаныя грошы сам купіць гарэлку. Пасля таго як нахабнік сышоў, жанчына тэрмінова патэлефанавала ў міліцыю. Вартавыя правапарадку прыехалі на месца здарэння і затрымалі аматара чужога.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**




# ЧЭРГІ ЛЯ БІЛЕТНЫХ КАСАЎ НЕ ЗМЯНШАЮЦЦА



**Агульным нацыянальным святам назвалі «Славянскі базар у Віцебску» прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы на цырымоніі адкрыцця мастацкага форуму. Сёлета фестываль праходзіць з небывалым размахам: рэкордная колькасць гасцей і ўдзельнікаў — звыш 4500 чалавек з 32 краін свету; мерапрыемстваў (больш за 100 разнастайных канцэртаў, экспазіцый, кірмашоў, рамёстваў, тэатральных і кінапрэм'ер); акрэдытаваных журналістаў (больш за 460 зарэгістраваных, і яшчэ некалькі дзесяткаў заявак паступілі ў дырэкцыю фэсту гэтымі днямі). Самымі прадстаўнічымі па традыцыі з'яўляюцца дэлегацыі Беларусі і Расіі, а сцягі, напрыклад, Балівіі, Венгрыі і Кубы ўзняліся на фестывальнай пляцоўцы ўпершыню.**

Па традыцыі на кожным фестывалі адбываецца ўручэнне спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Сёлета гэтай узнагароды была ўдастоена вядомая спявачка Сафія Ратару.

Віцебская публіка ўпершыню мела магчымасць загадзя пазнаёміцца з удзельнікамі конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні — 22 артысты з 19 краін свету «прэзентаваліся» 5 ліпеня на канцэрце «Прывітанне, фестываль!» і 6 ліпеня на ўрачыстым адкрыцці XVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». (Адзначым, дарэчы, што беларускія канкурсанты Ганна Благава і Георгій Калдун настроены на сур'ёзную барацьбу, але асаблівага піетэту перад больш вопытнымі і тытулаванымі канкурэнтамі не адчуваюць.)

Дарэчы, сёлета «на кану» ўзнагарод, акрамя гран-пры і першых трох прэмій, знаходзяцца спецыяльныя прызы Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

І ў дзіцячым, і ў дарослым конкурсе такіх прызоў будзе два: «Лепшаму выканаўцу Беларусі» і «Лепшаму выканаўцу Расіі». Дзецям, напрыклад, дастануцца сучасныя лічбавыя фотаапараты, а для дарослых узнагароды будуць больш «важкія», ва ўсіх сэнсах. Якія менавіта — дазнаемся 10 і 11 ліпеня.

Адметным у фестывальным календары абяцае стаць Дзень Беларусі, які праходзіць якраз сёння. Так, адкрываецца выстава-кірмаш музычных інструментаў, арганізаваная майстрамі Беларускага саюза музычных дзеячаў; прэзентуецца альбом лепшых песень Якава Навуменкі — «Залатыя песні».

Прэзідэнцкі аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Віктара Бабарыкіна дасць дабрачынны канцэрт, а позна ўвечары адбудзецца гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі «Ад роднае зямлі, ад гоману бароў», прысвечаны 125-годдзю нашых класікаў — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Як адзначыў дырэктар фестывалю, заслужаны дзеяч мастацтваў Радзівон Бас, гэтаксама практычна ў кожным канцэрце не будзе пазбаўлена ўвагі яшчэ адна знакавая дата — 120-годдзе знакамітага мастака, які праслявіў Віцебск, Марка Шагала. У ноч з суботы на нядзелю ў Летнім амфітэатры будзе горача — пляцоўку зоймуць зоркі «Еўрабачання» (прычым, як мяркуецца, шляхам апытання публікі будуць вызначаны кандыдаты на «Еўрабачанне-2008»).

А ў перспектыве пляцоўка амфітэатра, рэканструкцыя якой абышлася практычна ў два фестывальныя бюджэты — каля 46 мільярдаў рублёў, — будзе выкарыстоўвацца па максімуму, з мая па верасень— пачатак кастрычніка.

Напрыклад, як расказаў міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук, у верасні сцэну амфітэатра «загрузяць» мерапрыемствы гарадскога і абласнога значэння — фестывалі студэнцкай творчасці, ваенна-патрыятычнай песні і г.д. У наступным годзе ў бізнэс-плане — канцэрты выканаўцаў і калектываў як з розных рэгіёнаў Беларусі, так і з блізкага і далёкага замежжа. Гэтаксама абмяркоўваецца варыянт адкрыцця на базе амфітэатра прэм'ернага рэспубліканскага кінатэатра.

***P.S. Паводле слоў Радзіона Баса, на фестывальныя канцэрты яшчэ пазаўчора было прададзена каля 83 працэнтаў білетаў. Ад сябе дададзім, што чэргі ля білетных касаў не змяншаюцца.***

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## «ФЕСТЫВАЛЬ «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ» — ГЭТА ВІЗІТНАЯ КАРТКА БЕЛАРУСІ»

**Гэты факт асабліва адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы Летні амфітэатр у Віцебску.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць падтрымання духу сумленнага спаборніцтва на гэтым папулярным міжнародным конкурсе. «Павінны перамагаць таленавітыя — тады гэта будзе сапраўдная слава для нашага фестывалю», — лічыць Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным адкрыць у Беларусі цэх па мастацкаму ліццю. Гэта пытанне Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў з вядомым мастаком Міхаілам Шэмякіным у час наведвання Віцебскай абласной філармоніі.

«Мы такія рэчы цяпер закупляем за мяжой, а ўсё гэта можа і павінна выраблядца ў Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Як чакаецца, у час рабочай паездкі ў Віцебскую вобласць кіраўнік дзяржавы азнаёміцца з сацыяльна-эканамічным развіццём рэгіёна, а таксама наведае шэраг аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры Віцебска, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў прэс-службе беларускага лідара.

## У Мінск прыбудуць мошчы святога

**8 ліпеня ў Мінск прыбываюць мошчы святога апостала і евангеліста Лукі. У 15 гадзін 15 хвілін Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі сустрэне мошчы ў аэрапорце «Мінск-2». У 16 гадзін 20 хвілін Святыня будзе прывезена ў сталічны прыход у гонар іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць», у храм Прападобнай Ефрасінні Полацкай (вул. Прытыцкага, 65).**

З паловы пятай у нядзелю да 11 ліпеня будзе адкрыты кругласутачны доступ да мошчаў для пакланення вернікаў. Раніцай 12 ліпеня Святыня самалётам вылеціць у Салонікі (Грэцыя).

Святога Луку мы ведаем як аўтара аднаго з чатырох Евангелляў, першага іканапісца і ўрача. Гэта ўвогуле быў чалавек надзвычай адораны і адукаваны. Ён прыйшоў з сірыйскага горада Анціохія ў Іерусалім якраз у той момант, калі там прапаведаваў Ісус Хрыстос. Ён належыць да ліку сямідзесяці меншых апосталаў, якія былі абраны Ісусам Хрыстом. Яшчэ пры жыцці Хрыста апостал Лука быў пасланы Гоcпадам на пропаведзь Царства Божага ў іудзейскія гарады.

Падчас Крыжовых Пакут многія вучні пакінулі свайго Настаўніка. З ліку сямідзесяці засталося толькі некалькі самых верных і мужных. Сярод іх быў і Лука, і за цвёрдасць сваёй веры ён быў узнагароджаны радасцю першым бачыць Хрыста пасля Уваскрэсення. На трэці дзень пасля смерці Ісуса Лука з іншым апосталам — Клеопаю ішлі ў



сяленне Емаус, якое знаходзілася ў кіламетрах 12 ад Іерусаліма. Па шляху да іх далучыўся Сам Уваскрослы Ісус, якога яны не пазналі. Ён распытаў іх пра іх гора і патлумачыў ім, што адбылося тое, пра што сказана ў Пісанні. У той жа дзень падчас вячэры ў Емаўсе Хрыстос адкрыўся ім. Гэты выпадак Лука апісвае ў Евангеллі, не называючы сябе па імені.

Цела святога Лукі было пахавана ў Фівах. На яго магілу Гасподзь пасылаў дажджом асаблівае рэчыва, якое вернікі выкарыстоўвалі для лячэння хворых вачэй. Пры труне адбывалася вялікая колькасць вылечванняў і ад многіх іншых хвароб. Пазней мошчы былі перанесены ў Канстанцінопаль.

Сёлета, 9 чэрвеня, чэсная глава апостала і евангеліста Лукі была прынесена па блаславенню Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II са святой гары Афон у межы Рускай праваслаўнай царквы: Расію, Украіну і Беларусь. Арганізатар прынясення Святыні — Фонд Андрэя Першазванага. Мінск — апошні пункт знаходжання рэліквіі перад вяртаннем на Афон.

«Прыйдзіце, паклонімся і прыпадзём да святога апостала і евангеліста Лукі, просячы настаўлення сэрца, прасвятлення розуму і вылечвання цела ў імя Айца і Сына і Святога Духа,» — звяртаецца да вернікаў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

*АСБ «Беларусбанк» информирует о продлении приема денежных средств на срочный банковский вклад*
**в иностранной валюте**
**«ПРАЗДНИЧНЫЙ».**

Особые условия вклада «Праздничный»:
- Срок хранения вклада — 2 месяца.
- Фиксированная процентная ставка в течение срока хранения вклада — 7% годовых.
- Минимальная сумма для открытия вклада — не ограничена.
- Валюта вклада — доллары США или евро.
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Ежемесячная капитализация дохода и его выплата.

Дополнительную информацию можно получить на веб-сайте банка
http://www.belarus-bank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства имущества, расположенного в д. Тимковичи Копыльского района: **Лот 10** — нефтебаза (здание нефтебазы общ. пл. 85,6 кв.м, площадка с навесом для хранения масел, подъездная автодорога, подъездной железнодорожный путь, ограждение, емкости от 10 до 400 куб.м (36 ед.), приводное устройство ВЦК 40-120 и др. имущество), начальная цена — 691 046 417 рублей; **Лот 11** — заправка (здание АЗС общ. пл.14,9 кв м, емкости 10 куб.м. и 400 куб.м (2 ед.), 2 колонки раздаточные «Нара-27М/С» с пультом «Сапсан-1.1»), начальная цена — 62831635 рублей. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «Белпромстройбанк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690 324 015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома на основании заявления победителя аукциона. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 09.08.2007 г. в 14.30 по адресу: г. Копыль, площадь Ленина, д. 6, актовый зал райисполкома. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 08.08.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 322.

**Контактный телефон (8-017) 224-61-34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

**с 9 июля 2007 года**

**НОВЫЙ ВКЛАД в белорусских рублях**

**"Удобный плюс"**


УДОБНО И ПРОСТО!
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.
- Автоматическое переоформление на новый срок, аналогичный первоначальному. Указанное правило действует один раз.
- По истечении двух сроков хранения производится переоформление на новый вклад "ЮБИЛЯР"

**Вносится наличными и безналичными денежными средствами**
Срок хранения вклада — 25 календарных дней
Фиксированная ставка — **12% годовых**
Минимальная сумма вклада — **100 000 белорусских рублей**

Сохранность и возврат вкладов в АСБ «Беларусбанк» гарантируются в порядке, установленном законодательством РБ.

**www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка РБ № 1 от 27.10.2006г.

